BELARUS BEEHIVE

БАНК ИДЕЙ

# ПАМЯЦЬ У ЛАНДШАФЦЕ БЕЛАРУСКІХ ГАРАДОЎ:

## ПОМНІКІ І ІНШЫЯ МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ АБ’ЕКТЫ АБЛАСНЫХ ЦЭНТРАЎ БЕЛАРУСІ



ДАСЛЕДАВАННЕ ПАДРЫХТАВАНА Ў РАМКАХ ПРАЕКТА **BELARUS BEEHIVE**, КААРДЫНАТАР ДАСЛЕДЧАЙ І ЭКСПЕРТНАЙ ЧАСТКІ ПРАЕКТА – ІНСТЫТУТ «**ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА**».

Андрэй Мастыка, Андрэй Казакевіч, Уршуля Кацінская

# ПАМЯЦЬ У ЛАНДШАФЦЕ БЕЛАРУСКІХ ГАРАДОЎ: ПОМНІКІ І ІНШЫЯ МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ АБ’ЕКТЫ АБЛАСНЫХ ЦЭНТРАЎ БЕЛАРУСІ

BELARUS BEEHIVE

БАНК ИДЕЙ

Даследаванне падрыхтавана ў рамках праекта Belarus Beehive, каардынатар даследчай і экспертнай часткі праекта – Інстытут «Палітычная сфера».

Даследчыя цэнтры, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі даследчай часткі праекта: Цэнтр новых ідэй, Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў, Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі, даследчы цэнтр BEROC, аналітычны праект «Наше мнение», даследчы цэнтр CASE-Belarus, SYMPA.

2024

# ЗМЕСТ

Метадалогія.......................................................................... 6
Гарадская прастора Брэста. ....................................................... 8
Гарадская прастора Гродна.......................................................... 13
Гарадская прастора Віцебска......................................................... 16
Гарадская прастора Магілёва......................................................... 20
Гарадская прастора Гомеля............................................................ 23
Падсумаванне і высновы. ............................................................ 26
Рэкамендацыі ................................................................................. 30
Дадатак.............................................................................................. 32

Манументы, помнікі і інш. мемарыяльныя аб'екты накіраваны на ўмацаванне калектыўнай памяці, служаць увекавечанню найбольш значных падзей у гісторыі нацыі, павінны захаваць падзеі ў памяці тых, хто іх непасрэдна не перажываў. Таксама яны задаюць пэўную інтэрпрэтацыю, дапамагаюць выканаць асноўную задачу калектыўнай памяці – вызначаць, што ў дадзенага народа ёсць агульнага. Таму мемаратыўны ландшафт горада, як краіны ў цэлым, з'яўляецца важным элементам у падтрыманні пэўнага гістарычнага вобразу мінулага і з'яўляецца аб'ектам палітыкі памяці дзяржавы.

Важнае месца мемарыялаў мы бачым і ў гістарычнай палітыцы, якую рэалізуюць беларускія ўлады. Пасля палітычнага крызісу 2020 г. улады актыўна выкарыстоўваюць мемарыялы і помнікі ў сваіх камемаратыўных практыках. Рэгулярна праходзяць памятныя мерапрыемствы ў мемарыяльных комплексах Хатынь, Курган Славы, Брэсцкая крэпасць, дзе праводзяцца ўрачыстыя цырымоніі з удзелам палітыка Аляксандра Лукашэнкі, прымеркаваныя да розных памятных дат, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной (ВАВ). Падчас такіх мерапрыемстваў мемарыялы выкарыстоўваюцца як трыбуна для выступаў, у якіх для абгрунтавання палітычных рашэнняў часта выкарыстоўваюцца гістарычныя матывы. У 2022 годзе – Годзе гістарычнай памяці – асноўнай формай удзелу розных арганізацый і ўстаноў (ад устаноў адукацыі да буйных прамысловых прадпрыемстваў і дзяржаўных службаў) у справе «захавання гістарычнай памяці» была арганізацыя разнастайных памятных мерапрыемстваў (мітынгаў,

ускладання вянкоў, упарадкавання тэрыторыі і г. д.) каля мемарыялаў, помнікаў, памятных табліц і знакаў.

Пасля пачатку вайны ва Украіне беларускімі ўладамі ў гістарычнай палітыцы пачало прасоўвацца расійскае бачанне мінулага, з яго каланіяльным стаўленнем да тэрыторый постсавецкіх краін, у тым ліку Беларусі. На ўзроўні камемаратыўнай прасторы Беларусі гэта перарасло ў вайну памяці, у якой дзяржава перайшла да фізічнага знішчэння непажаданых памятных месцаў. Помнікі і шыльды прыбіраюцца з публічнай прасторы, зносяцца надгробкі і разбураюцца магілы і могілкі. Такім чынам быў прыбраны помнік з магілы Ларысы Геніюш у Зэльве, дэмантаваны памятны знак у гонар паўстання 1863 г. у Гродне. Таксама сюды можна аднесці акцыю па знішчэнні помнікаў і магіл салдатам Арміі Краёвай у Гродзенскай вобласці. У той жа час у цэнтры Мінска ўзводзіцца манумент у гонар Аляксандра Неўскага.

Садзейнічае ж паслядоўнаму і паступоваму насаджэнню такога прарасійскага стаўлення камемаратыўная палітыка беларускага рэжыму, якая праводзілася амаль 30 гадоў. Галоўная яе рыса – захаванне і працяг савецкай мемарыяльнай традыцыі, недапушчэнне дэкамунізацыі ў прасторы памяці, захаванне агульных з Расіяй памятных мясцін, герояў і практык мемарыялізацыі.

Важнай асаблівасцю такой палітыкі з'яўляецца арыентацыя на памяць пра ВАВ, якая цалкам грунтуецца на познесавецкай трактоўцы ВАВ і камемаратыўных аб'ектах і практыках таго ж перыяду, без перагляду падзей вайны як з нацыянальна арыентаванага пункту гледжання, так і без уліку сучасных навуковых гістарычных ведаў аб гэтай вайне. І калі ў ранейшыя часы (да 2020 года) дапускалася паралельнае існаванне памяці пра іншыя перыяды гісторыі, заснаванай на альтэрнатыўным нацыянальным нарматыве, то цяпер сітуацыя відавочным чынам

змянілася: назіраецца тэндэнцыя да насаджэння адзінай афіцыйнай інтэрпрэтацыі гісторыі, дзе камемаратыўныя аб’екты служаць прасоўванню савецкага і прарасійскага наратываў.

**Мэта даследавання:** правесці аналіз камемаратыўнага ландшафту беларускіх гарадоў, выявіць, якія мемарыяльныя аб’екты прадстаўлены, вызначыць, месцы якой і чыёй памяці дамінуюць і, наадварот, якія лакуны існуюць, чыя памяць і пра што не прадстаўлена ў гарадской публічнай прасторы. На аснове аналізу даць ацэнку сітуацыі і скласці рэкамендацыі па змене ландшафту на карысць захавання нацыянальнай памяці і дэмакратычнага плюралістычнага падыходу да працэсу мемарыялізацыі.

## Метадалогія

У якасці аб’ектаў былі абраныя мемарыялы, манументы і помнікі, мемарыяльныя знакі, камяні, пліты, мемарыяльныя дошкі, а таксама помнікі на месцах масавых пахаванняў або індывідуальныя надмагільныя помнікі асоб, якія вылучаюцца як публічныя аб’екты для ўшанавання, месцы правядзення памятных мерапрыемстваў і г. д. Таксама даследаваліся і жанравыя скульптурныя кампазіцыі. Але, ў адрозненне ад помнікаў, яны часта не носяць памятны характар, а маюць толькі мастацкае значэнне альбо забаўляльны, камерцыйны і г. д. характар. Аднак і гэтыя аб’екты браліся пад увагу падчас даследавання, калі яны наўпрост ці ўскосна адсылаюць да гістарычных ці культурных з’яў, падзей ці асоб беларускага, савецкага ці інш. мінулага.

У якасці крыніц выкарыстоўвалася адкрытая інфармацыя пра мемаратыўныя аб’екты, якая знаходзіцца ў вольным доступе. Звесткі наконт помнікаў, пахаванняў, памятных табліц і знакаў і г. д. часам размяшчаюцца

на афіцыйных рэсурсах дзяржаўных устаноў (гарадскіх і абласных выканаўчых саветаў, міністэрстваў і ведамстваў), дзяржаўных культурных устаноў (музеяў, бібліятэк і г. д.), нават асобных прадпрыемстваў ці службаў, калі памятны аб'ект знаходзіцца на тэрыторыі ці абслугоўваецца/даглядаецца пэўным прадпрыемствам. Таксама звесткі браліся з артыкулаў, даведак, навінных паведамленняў з інфармацыйных гарадскіх парталаў, анлайн-энцыклапедый і даведнікаў па гісторыі, архітэктуры, урбаністыцы беларускіх гарадоў, інтэрнэт-праектаў па захаванні памяці, дзяржаўных СМІ і рэгіянальных медыя. Для высвятлення месцазнаходжання, верыфікацыі аб'ектаў выкарыстоўваліся таксама інтэрнэт-мапы google.maps і yandex-карты (дзе ёсць фота, лакалізацыя і часам апісанне аб'ектаў).

Такім чынам была сабраная інфармацыя аб мемарыяльных аб'ектах у 5 абласных цэнтрах Беларусі: Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Магілёў. У межах аналізу былі ўзятыя ўсе абласныя гарады за выключэннем сталіцы. Асноўная інфармацыя, якая збіралася па помніках (ды іншых мемарыяльных аб'ектах): месцазнаходжанне, дата ўстаноўкі і аўтарства (калі вядомае), кароткае апісанне аб'екта.

Для вызначэння прыналежнасці аб'ектаў да пэўнай гісторыка-культурнай традыцыі і выяўлення асаблівасцей той памяці, якую яны транслююць, былі вылучаныя тры параметры: 1) які гістарычны перыяд адлюстроўваецца, 2) якой тэматыцы (асобе, падзеі, з'яве) прысвечаны і 3) чыю памяць прадстаўляе (пэўнай дзяржавы, нацыі, этнасу, супольнасці). Калі разглядаць храналагічна, то аб'екты можна падзяліць на 4 перыяды: а) гісторыя да XIX ст., б) XIX ст., в) XX ст. г) найноўшая гісторыя Беларусі (ад 1991 да сённяшняга часу) (гл. Табл. 1а ў дадатку). Невялікая частка аб'ектаў не носіць часавай прывязкі, пераважна да яе адносяцца жанравыя скульптуры і кам-

пазіцыі, якія адлюстроўваюць абстрактныя, прыродныя ці іншыя агульнакультурныя з'явы і сюжэты, і яны не ўключаліся ў аналіз. Помнікі аб'ядноўваліся намі ў тэмы ад канкрэтных да агульных, каб уніфікаваць пералік тэм для ўсіх гарадоў. Прыналежнасць памяці вызначалася паводле этна-нацыянальнай ці дзяржаўна-палітычнай прыкметы, такім чынам, па нацыянальнай прыналежнасці памяць падзялялася на беларускую, рускую, польскую і г. д. Паводле дзяржаўна-палітычнай прыкметы былі вылучаны савецкая і беларуская савецкая памяць, беларускі аспект у складзе савецкай памяці дазволіў вызначыць, якая памяць дамінуе сярод помнікаў, прысвечаных перыяду СССР: агульнасавецкая або ўсё ж лакальная беларуская, то-бок з прывязкай да БССР, мясцовай культуры і традыцый. Аналіз вышэй адзначаных параметраў дапаможа высветліць, да якой гістарычнай эпохі часцей за ўсё апелююць помнікі і якія тэмы найперш прадстаўленыя, а якія, наадварот, «забытыя».

## Гарадская прастора Брэста

Для аналізу мы ўзялі мемаратыўныя аб'екты ўнутры самога горада, выключыўшы з разгляду мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць», бо гэты мемарыял у аснове сваёй прысвечаны адной падзеі – пачатку ВАВ і гераічнай абароне, таму натуральным чынам будзе сваім аб'ёмам і зместам засланяць іншыя з'явы і падзеі, якія былі мемарыялізаваны ў Брэсце.

У Брэсце было прааналізавана 279 аб'ектаў. Асноўны масіў, 196 аб'ектаў, склалі помнікі, мемарыялы, памятныя таблічы і інш. падобныя месцы, рэшту – жанравыя кампазіцыі.

Калі глядзець храналагічна, то аб'ектаў, звязаных з гістарычным перыядам да XIX ст., усяго 9 (Табл. 1). Як мы бачым, сярод помнікаў, датычных да гэтай эпохі, 2

**Табліца 1.** Мемаратыўныя аб’екты Брэста, прысвечаныя перыяду гісторыі да XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Расійская |
|---|---|---|
| Старажытная гісторыя (заснаванне горада) | 2 | |
| Культура перыяду ВКЛ | 2 | |
| Гарадская гісторыя перыяду ВКЛ | 3 | |
| Вайсковая гісторыя Расійскай імперыі (задушэнне паўстання Касцюшкі 1794 года) | | 2 |

адлюстроўваюць расійскі гістарычны наратыў: абодва прысвечаныя задушэнню паўстання Т. Касцюшкі 1794 г. войскамі пад камандаваннем Суворава.

З гісторыяй XIX ст. звязана 15 камемаратыўных аб’ектаў (Табл. 2). З іх да беларускага нацыянальнага кантэксту можна аднесці толькі 3 помнікі, якія датычацца лакальнай гісторыі. Сферу культуры ў пераважнай большасці прадстаўляюць аб’екты, прысвечаныя расійскай спадчыне. Наогул, расійскі гістарычны кантэкст пераважае ў памяці пра XIX ст., адлюстраванай у гарадскім ландшафце Брэста.

Гісторыі XX ст. прысвечаны 160 аб’ектаў, абсалютная большасць з якіх – памяць пра савецкую эпоху (гл. у дадатку Табл. 2а.). Сярод памятных месцаў, датычных да перыяду СССР, пераважаюць тыя, што прысвечаныя падзеям ВАВ. Тэма вайны прадстаўлена ў першую чаргу праз ушанаванне памяці ўдзельнікаў, загінулых салдат і пагранічнікаў, камандуючых, герояў СССР і г. д. Толькі

**Табліца 2.** Мемаратыўныя аб’екты Брэста, прысвечаныя XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Расійская | Беларуская | Яўрэйская | Польская | Украінская | Нейтральная |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Культура і літаратура | 6 | | | 1 | 1 | |
| Гарадская гісторыя | | 3 | 1 | | | 1 |
| Вайсковая гісторыя Расійскай імперыі | 2 | | | | | |

нязначная частка мемаратыўных аб'ектаў прысвечана памяці ахвяраў вайны (мірнаму насельніцтву, ваеннапалонным, вязням канцлагераў), да якіх можна далучыць яшчэ помнікі ахвярам Халакосту ў Брэсце.

У Брэсце адносна няшмат помнікаў, прысвечаных Кастрычніцкай рэвалюцыі і дзеячам камуністычнага і рэвалюцыйнага руху. Тут дагэтуль захаваліся 3 помнікі і 1 мемарыяльная дошка ў гонар У. Леніна. Пры гэтым, за выключэннем Леніна, няма помнікаў і аб'ектаў, прысвечаных выключна савецкім ці рэвалюцыйным падзеям, дзеячам камуністычнай ідэалогіі, якія не мелі б непасрэднай сувязі з Беларуссю ці БССР.

У Брэсце варта вылучыць групу мемарыяльных аб'ектаў, звязаных з гісторыяй КПЗБ, камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі і падзеямі 1939 г. – так званага аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР, што з'яўляецца пэўнай асаблівасцю Брэста як аднаго з былых буйных гарадскіх цэнтраў Заходняй Беларусі.

Калі казаць пра памяць савецкай эпохі, то варта адзначыць невялікую колькасць помнікаў (толькі 8 аб'ектаў), прысвечаных сферы культуры і адукацыі, не асабліва прадстаўлены дзеячы нацыянальнай культуры рэспубліканскага маштабу, адсутнічаюць памятныя аб'екты, прысвечаныя дзеячам навукі.

З падзей познесавецкага часу адзначана ў мемаратыўнай прасторы Брэста вайна ў Афганістане. Гэтай падзеі прысвечаныя 2 аб'екты, што на фоне іншых абласных цэнтраў выглядае досыць сціпла (магчыма, не ўдалося знайсці ў адкрытым доступе дастаткова інфармацыі, бо часта мемарыяльныя дошкі воінам-інтэрнацыяналістам усталёўваюць на сценах ці ўнутры саміх школ, дзе навучаліся гэтыя асобы. Але па Брэсце такіх звестак не знайшлося). Тут варта адзначыць, што адзін з аб'ектаў – гэта

**Табліца 3.** Мемаратыўныя аб’екты Брэста, прысвечаныя найноўшай гісторыі

| Якія падзеі, героі, з’явы ўшаноўваюцца | Колькасць аб’ектаў |
|---|---|
| Армія і авіяцыя | 7 |
| Культура, мастацтва, адукацыя | 3 |
| Спорт | 3 |
| Праваахоўныя органы<br>(МУС і інш. сілавыя службы) | 3 |
| Архітэктура і будаўніцтва | 2 |
| Іншыя | 6 |

мемарыял, які знаходзіцца ў парку, прысвечаным памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Апроч помніка, на мемарыяле ў 2022 годзе была ўсталявана памятная пліта з імёнамі загінулых берасцейцаў. Таму ў гэтым выпадку не варта супастаўляць колькасна памяць аб вайне ў Афганістане з, напрыклад, памяццю пра Першую сусветную вайну, бо помнікі, прысвечаныя гэтай вайне (якіх у горадзе таксама два), знаходзяцца на могілках і вайсковых пахаваннях, яны не з’яўляюцца асобнымі мемарыяламі, знаходзяцца на маргінесе гарадскога ландшафту, у той час як парк у гонар воінаў-інтэрнацыяналістаў знаходзіцца на ўездзе ў горад і з’яўляецца адной з візітовак Брэста.

Завяршаючы агляд памятных месцаў, якія ўшаноўваюць савецкі перыяд, варта адзначыць, што ў Брэсце адсутнічае які-небудзь памятны аб’ект, прысвечаны аварыі на ЧАЭС у 1986 г. Гэта прытым што ўсходнія раёны Брэсцкай вобласці значна пацярпелі ў выніку катастрофы. Затое ў Брэсце існуе помнік «У гонар і на славу ўдзельнікаў стварэння ядзернага шчыта Савецкага Саюза». Помнік звязаны з горадам тым фактам, што падчас ядзернага выпрабавання ў 1954 г. на Тоцкім палігоне аснову групоўкі войскаў складаў Брэсцкі вайсковы гарнізон, які быў адпраўлены туды на вучэнні.

Аб'ектаў, якія адносяцца да этапу незалежнай РБ, – 24 (частка з іх усё ж звязана з перыядам БССР, бо дзеячы, памяць якіх ушаноўваецца, пачыналі свой творчы шлях у БССР ці дзяржорганы свае вытокі выводзяць з БССР). Сярод гэтых аб'ектаў (Табл. 3), як мы бачым, значную частку ў сукупнасці складаюць тыя, што прысвечаныя ўзброеным сілам або авіяцыі і праваахоўным органам.

У сваю чаргу досыць невялікая колькасць памятных месцаў, якія адносяцца да сферы культуры і асветы на сучасным этапе. Пэўнай асаблівасцю ў мемаратыўным ландшафце Брэста з'яўляецца мемарыяльная дошка ў гонар Міхаіла Машэнскага, вядомага гаспадарчага дзеяча, прадпрымальніка, заснавальніка СП «Санта Брэмар», яго ж імем названа вуліца, што вылучае персону, абраную для мемарыялізацыі, з шэрагу прынятых для ўшанавання ў беларускай камемаратыўнай практыцы.

Такім чынам, асноўная маса камемаратыўных аб'ектаў у Брэсце прысвечана гісторыі ВАВ, ушанаванню памяці ўдзельнікаў вайны, абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Разам з мемарыяльным комплексам у крэпасці гэта вызначае асноўную скіраванасць гарадскога мемаратыўнага ландшафту, які быў закладзены ў познесавецкі перыяд і працягвае развівацца і падтрымлівацца ў наш час. Аднак такая камемаратыўная палітыка стварае відавочны перакос, які прыводзіць да таго, што многія гістарычныя падзеі, выбітныя асобы і сферы жыцця застаюцца па-за межамі абшару гістарычнай памяці берасцейцаў.

Пэўную разнастайнасць у камемарацыйную прастору горада ўнеслі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 1000-годдзя горада. У цэнтры горада быў створаны манумент тысячагоддзя Брэста. Актыўна разбудоўваецца «Алея гарадскіх ліхтароў» на вуліцы Гогаля (за апошнія гады адкрыта больш за 40 аб'ектаў – жанравых кампазіцый). На жаль, большасць з іх мае або забаўляльна-

камерцыйны (накіраваны на рэкламу спонсара кампазіцыі), або агульнакультурны характар, а частка наогул створана па матывах творчасці М. Гогаля, што стварае хутчэй прарасійскі кантэкст, чым падкрэслівае мясцовую гарадскую гісторыю або лакальны каларыт.

## Гарадская прастора Гродна

Агульная колькасць аб’ектаў, якія разглядаліся ў Гродне, складае 180 адзінак. Храналагічная падзеленасць аб’ектаў прадстаўлена ў Табліцы 1а ў дадатку.

Паводле тэматычнай прадстаўленасці і нацыянальна-культурнай прыналежнасці аб’екты, датычныя памяці пра гістарычныя падзеі да XIX ст., размеркаваныя ў Табл. 4. Варта адзначыць, што ў Гродне найбольшая колькасць помнікаў, прысвечаных гэтай эпосе, сярод усіх абласных цэнтраў, а таксама найбольшая прадстаўленасць помнікаў катэгорыі менавіта беларускай нацыянальнай памяці. Сярод іх ёсць аб’екты, якія ўшаноўваюць памяць пра Грунвальдскую бітву, прысвечаныя князю Вітаўту, Антонію Тызенгаўзу і г. д. Пры гэтым прысутнічаюць помнікі, якія можна аднесці да польскага гістарычнага наратыву. Але яны непасрэдна звязаныя і з беларускім мінулым, бо гэтыя аб’екты ўшаноўваюць памяць пра такіх асобаў, як Стэфан Баторый і Тадэвуш Касцюшка, аднак па сваім выкананні яны належаць да польскай культурнай традыцыі (прысвячэнне зроблена па-польску, маюць адпаведныя акцэнты ў змесце прысвячэння).

Калі казаць пра аб’екты, прысвечаныя XIX ст. (Табл. 5), то тут мы бачым значна большае засілле «польскай» памяці, на што ўказвае наяўнасць аб’ектаў, звязаных з жыццём і творчасцю, напрыклад, Э. Ажэшкі і А. Міцкевіча, якія падаюцца ў мемаратыўных аб’ектах перш за ўсё як прадстаўнікі польскай культуры, хоць, безумоўна,

**Табліца 4.** Мемаратыўныя аб’екты Гродна, прысвечаныя перыяду да XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Польская | Яўрэйская |
|---|---|---|---|
| Старажытная гісторыя (заснаванне горада, археалагічная стаянка) | 2 | | |
| Палітычныя і вайсковыя дзеячы ВКЛ | 4 | 3 | |
| Культура перыяду ВКЛ (архітэктура і навука) | 3 | | |
| Вайсковая гісторыя перыяду ВКЛ | 2 | | |
| Гарадская гісторыя перыяду ВКЛ | 1 | | 1 |

у іх дзейнасці прысутны быў і беларускі чыннік. Адзіны помнік (памятны знак паўстанцам 1863 года), які адлюстроўваў беларускі наратыў у нацыянальна-палітычным аспекце і ўшаноўваў памяць пра супраціў паўстанцаў царскім жандарам у Гродне, сёлета быў прыбраны з гарадской прасторы.

Як і ў астатніх гарадах, XX ст. (гл. Табл. 3а ў дадатку) таксама ў сваёй большасці прадстаўлена савецкім перыядам гісторыі, дзе пераважае памяць пра ВАВ. Вайна рэпрэзентаваная таксама помнікамі, выкананымі ў савецкім камемаратыўным бачанні гісторыі вайны.

Як і ў Брэсце, тут прадстаўлена і памяць пра 1939 год, і дзейнасць камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі, але ёсць аб’екты – мемарыялы на вайсковых могілках,– якія

**Табліца 5.** Мемаратыўныя аб’екты Гродна, прысвечаныя XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Расійская | Польская | Нейтральная |
|---|---|---|---|---|
| Культура і літаратура | | | 4 | |
| Навука і адукацыя | | | 3 | 1 |
| Вайна 1812 | | 1 | | |
| Паўстанне 1863–1864 | 1(0) | | | |
| Тэхналогіі і транспарт | | | 1 | |
| Палітычныя і грамадскія дзеячы | | | 1 | |
| Гарадская гісторыя | | | | 1 |

**Табліца 6.** Мемарatыўныя аб'екты Гродна, прысвечаныя найноўшай гісторыі.

| Якія падзеі, героі, з'явы ўшаноўваюцца | Колькасць аб'ектаў |
|---|---|
| Культура, літаратура, мастацтва | 1 |
| Навука і адукацыя | 1 |
| Спорт | 2 |
| Праваахоўныя органы (МУС і інш. сілавыя службы) | 3 |
| Дзяржорганы і службы (МНС і інш.) | 3 |
| Медыцына | 2 |
| Іншыя | 2 |

ўшаноўваюць памяць польскіх жаўнераў, загінулых у 1939 годзе і падчас савецка-польскай вайны. Калі казаць пра характар прыналежнасці памяці, то можна заўважыць і тут прысутнасць польскага нацыянальнага фактару. У той жа час лепш, чым у Брэсце, прадстаўлены беларускі нацыянальны аспект у сферы культуры і асветы.

Калі прааналізаваць тэмы, якімі прадстаўлены сучасны перыяд гісторыі Беларусі (Табл. 6), то пабачым пэўную перавагу дзяржаўна-сілавой над гуманітарна-культурнай сферай.

Абагульняючы разгляд мемаратыўнага ландшафту Гродна, можна адзначыць, што тут выяўляецца ў большай ступені беларускі нацыянальны характар памяці аб мінулым, асабліва гэта добра заўважна па помніках, прысвечаных старажытнай гісторыі горада. Аднак тут жа прысутны і польскі нацыянальны фактар: аб'ектаў, звязаных з польскай спадчынай, найбольш засяроджана ў Гродне, калі параўноўваць з усімі абласнымі цэнтрамі. У значна меншай ступені прысутны расійскі гістарычны наратыў сярод помнікаў, датычных да перыяду да XX ст. Аднак ужо адносна перыяду XX ст. заўважаецца дамінаванне савецкай камемаратыўнай спадчыны, ушанаванне памяці не самых відавочных для Гродна агульнасавецкіх

рэвалюцыйных герояў, такіх як Шчорс і Чапаеў. Рэстаўрацыя і пасля ўрачыстая цырымонія адкрыцця абноўленага помніка Дзяржынскаму ў 2018 годзе кажа пра тое, што, нягледзячы на сваю ідэалагічную атавістычнасць, гэтая памяць захоўвала пэўныя сэнсы для цяперашніх уладаў яшчэ да 2020 года. З іншага боку, беларуская нацыянальная культура і асвета параўнальна добра прадстаўлена ў Гродне на ўзроўні памяці пра XX ст. і найноўшага перыяду, напрыклад, тут усталяваны адзін з двух помнікаў Я. Купалу, пастаўленых у абласных гарадах.

## Гарадская прастора Віцебска

У храналагічнай прадстаўленасці мемаратыўнага ландшафту Віцебска (гл. Табл. 1а ў дадатку) найменш з усіх абласных цэнтраў рэпрэзентавана гісторыя старажытнасці – усяго выяўлена 4 аб'екты (Табл. 7).

Варта адзначыць, што 2 аб'екты – сучасныя помнікі. Першы – гэта конны помнік вялікаму князю Альгерду, усталяваны ў 2014-м. Можна меркаваць, што другі помнік, Аляксандру Неўскаму, які паўстаў праз 2 гады, ужо ў 2016 годзе, быў усталяваны для захавання пэўнага парытэту ў прасторы памяці між нацыянальным гістарычным уяўленнем і прарасійскім бачаннем мінулага былых тэрыторый так званай «Кіеўскай Русі». Пры гэтым важную ролю ва ўзнікненні гэтага помніка ў Віцеб-

**Табліца 7.** Мемаратыўныя аб'екты Віцебска, прысвечаныя гістарычнаму перыяду да XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Расійская |
|---|---|---|
| Старажытная гісторыя (заснаванне горада) | 1 | |
| Палітычныя і вайсковыя дзеячы эпохі ВКЛ | 1 | |
| Вайскова-палітычныя дзеячы Расіі і Расійскай імперыі | | 2 |

ску адыграла праваслаўная царква, чыё бачанне і ўдзел у камемаратыўнай палітыцы ў Беларусі досыць заўважныя і патрабуюць асобнага разгляду, асабліва ва ўсходніх абласных цэнтрах. Аднак варта адзначыць, што, у адрозненне ад сёлетняй акцыі па ўсталяванні помніку Неўскаму ў Мінску, якая, відавочна, носіць характар дэманстратыўнага навязвання пэўнага ідэалагічнага наратыву, для ландшафту памяці ўзнікненне помніка ў Віцебску і ягонае гістарычнае абгрунтаванне было праведзена з большай далікатнасцю і з улікам беларускага нацыянальнага кантэксту. Бо помнік прадстаўляе сабой не ваяўнічы конны манумент, а кампазіцыю, на якой, апроч наўгародскага князя, прысутнічае і яго жонка – віцебская княжна Аляксандра з сынам.

Сярод памятных месцаў Віцебска, якія прадстаўляюць XIX ст., сфера культура рэпрэзентавана выключна расійскімі літаратарамі (Табл. 8). Беларускі нацыянальны фактар прысутны ў сферы навукі і асветы і ў лакальнай гісторыі транспарту і рэлігійнай архітэктуры. У Віцебску знаходзяцца адзіны сярод абласных гарадоў буйны манумент і мемарыяльныя могілкі ў памяць пра герояў вайны 1812 г. (створаны яшчэ ў 1912 годзе да святкавання стагоддзя ад тых падзей)[1], агулам гэтай вайне прысвечаны толькі яшчэ адзін памятны знак у Брэсце, усталяваны на месцы бою расійскіх і французскіх войскаў. Памяць аб падзеях вайны 1812 года ў Віцебску спалучана з гісторыяй ВАВ, таму што на месцы мемарыяльных могілак размешчаны таксама магілы чырвонаармейцаў і ўсталяваны помнік у выглядзе скульптур савецкіх салдат. Гэта практыка мусіла падмацоўваць савецкі гісторыка-ідэалагічны наратыў, які падкрэсліваў пераемнасць і сувязі абедзвюх войнаў як па назве, так і па вызваленчым характары. І зараз мы можам назіраць паўтарэнне гэтага

[1] Спасылка

**Табліца 8.** Мемаратыўныя аб'екты Віцебска, прысвечаныя XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Расійская |
| --- | --- | --- |
| Культура і літаратура | | 3 |
| Навука і адукацыя | 2 | |
| Вайна 1812 года | | 3 |
| Гісторыя тэхналогій і транспарту | 4 | 1 |
| Гісторыя горада XIX ст . | 3 | |

дыскурсу, калі мемарыяльны комплекс агулам называюць месцам памяці вызваліцелям Віцебшчыны[1].

Як і ў астатніх гарадах, у Віцебску гісторыя ВАВ дамінуе над іншымі тэмамі, якія адлюстроўваюць памяць пра XX ст. (гл. Табл. 4а ў дадатку). Але статус так званай «культурнай» сталіцы Віцебска на ментальнай мапе Беларусі адбіваецца і ў яго мемаратыўнай прасторы. У горадзе значна больш аб'ектаў, прысвечаных культуры – у першую чаргу беларускай савецкай і нацыянальнай беларускай. Адначасова ў Віцебску ўжо больш аб'ектаў, звязаных з Кастрычніцкай рэвалюцыяй і камуністычнымі дзеячамі, чым у «заходніх» абласных цэнтрах.

У Віцебску шырока прадстаўленая мілітарная сфера. Верагодна, гэта звязана з уплывам на мемарыяльную палітыку камандавання 103-й асобнай паветранадэсантнай брыгады, якая месціцца ў горадзе. Прынамсі, па ініцыятыве і з удзелам кіраўніцтва гэтай брыгады ў Віцебску за апошняе дзесяцігоддзе ўсталяваны помнік дэсантнікам і некалькі памятных шыльд у гонар камандуючых ПДВ[2]. Вайсковая гісторыя і гісторыя ПДВ таксама ўвасабляецца ў памяці пра вайну ў Афганістане,

1 Спасылка
2 Спасылка; Спасылка

бо ў Віцебску, як і ва ўсіх іншых абласных цэнтрах, ёсць асобны помнік, прысвечаны воінам-інтэрнацыяналістам, але пашырэнню гэтай тэмы ў мемаратыўнай прасторы Віцебска спрыяе і існаванне тут музея воінаў-інтэрнацыяналістаў[1]. Экспазіцыя музея шмат у чым грунтуецца на гісторыі ўдзелу ў вайне 103-й брыгады і 339-га ваенна-транспартнага авіяцыйнага палка, якія размяшчаўся ў той перыяд таксама ў Віцебску.

У дачыненні да памяці пра найноўшы час мы бачым (Табл. 9), што працягваецца тая ж тэндэнцыя: асноўнымі тэмамі з'яўляюцца культура і мілітарная сфера. Ушанаванне вайсковай славы звязана з прысутнасцю тут згаданых ужо дэсантнай і авіяцыйнай часцей. Так, напрыклад, з'явіўся прыгаданы вышэй помнік віцебскім дэсантнікам (які ўслаўляе высокі статус сучасных войск ПДВ і адсылае да савецкай вайсковай традыцыі, бо ў яго кампазіцыі ўзгадваюцца асобы камандуючых ПДВ СССР), а таксама помнік авіятарам 339-га палка, усталяваны ў 2012 г.

**Табліца 9.** Мемаратыўныя аб'екты Віцебска, прысвечаныя найноўшай гісторыі.

| Якія падзеі, героі, з'явы ўшаноўваюцца | Беларуская | Расійская |
|---|---|---|
| Культура, літаратура, мастацтва | 1 | 1 |
| Навука і адукацыя | 1 | |
| Армія і авіяцыя | 3 | |
| Рэлігійныя | | 1 |
| Праваахоўныя органы (МУС і інш. сілавыя службы) | 1 | |
| Спорт | 1 | |
| Медыцына | 1 | |

1 Спасылка

Сярод помнікаў, датычных да культуры на сучасным гістарычным этапе, варта вылучыць памятную шыльду ў гонар заснавальніка «Славянскага базару» Радзівона Баса, бо гэта адна з першых спроб мемарыялізацыі з’явы сучаснай масавай культуры ў Беларусі. Сюды таксама мы аднеслі і так званую «Алею зорак», але, у адрозненне ад згаданай шыльды, гэты аб’ект хутчэй прадстаўляе расійскі культурны кантэкст, бо ў большасці турыстычных апісанняў і інфармацыйных даведак атракцыйнасць алеі вызначаецца пералікам імёнаў прадстаўнікоў расійскай папулярнай эстрады, ушанаваных на ёй[1].

## Гарадская прастора Магілёва

У гарадской прасторы Магілёва выяўлена найменш камемаратыўных аб’ектаў сярод астатніх абласных цэнтраў рэспублікі, адпаведна, і па розных гістарычных этапах колькасць помнікаў меншая, чым у іншых гарадах (гл. Табл. 1а ў дадатку).

Наконт аб’ектаў, якія адлюстроўваюць памяць пра гісторыю да XIX ст. (Таб. 10), можна сказаць, што тут добра прадстаўлена менавіта нацыянальная ці лакальная гісторыя горада, хоць і нешматлікай колькасцю помнікаў. Але ёсць важная асаблівасць, якая выяўляецца ў тым,

**Табліца 10.** Мемаратыўныя аб’екты Магілёва перыяду гісторыі да XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Агульнакультурная |
|---|---|---|
| Старажытная гісторыя (заснаванне горада) | 2 | |
| Гісторыя горада эпохі ВКЛ | 2 | |
| Культура (асвета, музыка) | 3 | 1 |

1 Спасылка

**Табліца 11.** Мемаратыўныя аб’екты Магілёва, прысвечаныя XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Расійская | Украінская |
|---|---|---|---|
| Культура і літаратура | | 3 | 1 |
| Навука і адукацыя | 2 | | |
| Гісторыя тэхналогій і транспарту | 1 | 1 | |
| Паўстанне дзекабрыстаў | | 1 | |

што адразу тры з гэтых аб’ектаў прысвечаныя адной постаці – праваслаўнаму рэлігійнаму дзеячу і асветніку Георгію Каніскаму. І постаць гэтая абраная не выпадкова, бо відавочным ініцыятарам кампаніі па прасоўванні менавіта гэтай асобы з’яўляецца Беларуская праваслаўная царква. Таму варта адзначыць, што і тут назіраецца пэўны ўплыў БПЦ у камемарацыйнай палітыцы пры яўным патуранні з боку дзяржавы і мясцовых уладаў. Адпаведна, сярод гістарычных дзеячаў Магілёва выбраная была такая постаць, якая падкрэслівае спрадвечны праваслаўны характар горада, адначасова мае дачыненне да гісторыі Рускай праваслаўнай царквы і ўспрымаецца ў беларускім гістарычным наратыве як асоба з прарасійскімі поглядамі. Невыпадкова, што новы помнік «Выдатнаму асветніку зямлі беларускай свяціцелю Георгію Каніскаму» ўрачыста адкрываў і асвячаў сам мітрапаліт Веніямін[1].

Калі казаць пра XIX ст. (Табл. 11), то аб’екты, якія рэпрэзентуюць гэту эпоху, не вылучаюцца шматлікасцю і адлюстроўваюць тую ж тэндэнцыю: культура гэтага перыяду прадстаўлена выключна небеларускімі творцамі, а найперш расійскі фактар дамінуе ва ўвасабленні гэтай эпохі ў мемаратыўных аб’ектах.

Сярод аб’ектаў, датычных да гісторыі XX ст. (гл. Табл. 5а ў дадатку), дамінуе памяць пра ВАВ, а таксама

---

[1] Спасылка

**Табліца 12.** Мемаратыўныя аб’екты Магілёва, прысвечаныя найноўшай гісторыі.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Расійская |
|---|---|---|
| Культура, літаратура, мастацтва | 1 | 1 |
| Ідэалагічна-палітычныя | 3 | 1 |
| Праваахоўныя органы (МУС і інш. сілавыя службы) | 2 | |

рэвалюцыйны і камуністычны рух. Памяць пра вайну, як і ў іншых гарадах, прадстаўлена помнікамі ці шыльдамі, усталяванымі яшчэ ў савецкі час, або сучаснымі аб’ектамі, але выкананымі ў савецкай мемарыяльнай традыцыі. Вылучыць на гэтым фоне можна памятны знак «Хачкар», устаноўлены на набярэжнай Дняпра ў гонар 11 армян, якія змагаліся ў гады ВАВ за вызваленне Магілёўскай вобласці. Іх імёны пазначаны на мемарыяльнай пліце ля падножжа стэлы. Гэта адзін з мажлівых прыкладаў таго, як памяць пра вайну можа быць пераасэнсавана і рэпрэзентавана, абапіраючыся на нацыянальную культурную традыцыю. Таксама ў Магілёве вылучаюцца 2 сучасныя помнікі ахвярам ВАВ. Першы прысвечаны пацыентам Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы, знішчаным нацыстамі. Другі – гэта мемарыял «Дзеці міру – дзецям вайны». Гэтыя помнікі дэманструюць іншы, «несавецкі» падыход да адлюстравання памяці аб вайне, які на сённяшні дзень пачынае ўвасабляецца менавіта ў памяці аб мірных бездапаможных ахвярах, у адрозненне ад вайсковых помнікаў, дзе дагэтуль дамінуе гераічны пафас.

Сярод помнікаў, прысвечаных сучаснаму перыяду, у Магілёве можна вылучыць прысутнасць мемарыяльных аб’ектаў ідэалагічнай скіраванасці (Табл. 12). І сярод іх цікавасць выклікаюць два памятныя знакі «Народнага адзінства», якія амаль адначасова былі ўсталяваны ў Магілёве ў 2021 г. Праўда, у сваім мастацкім увасабленні абодва помнікі ніякім чынам не адсылаюць да падзей

1939 г. Адзін з іх быў пастаўлены ў парку каля ААТ «Хімвалакно», і з інфармацыйнага матэрыялу на сайце адміністрацыі Кастрычніцкага раёна вынікае, што досыць абстрактная кампазіцыя хутчэй прысвечана самому прадпрыемству «Хімвалакно», а ўжо яе адкрыццё было прымеркавана да дня «Народнага адзінства»[1]. Другі памятны знак быў адкрыты на плошчы каля Магілёўскага абласнога лячэбна-дыягнастычнага цэнтра, якой адначасова надалі назву – плошча Адзінства. Гэты помнік ужо нясе ў сабе нацыянальна-дзяржаўныя элементы. У цэнтры кампазіцыі – васілёк, вобраз, па меркаванні аўтара скульптуры, «просты, зразумелы, які лёгка счытваецца. Шэсць пялёсткаў абазначаюць шэсць абласцей нашай краіны. Апраўляе кветку ручнік з беларускім арнаментам, такім жа як на Дзяржаўным сцягу нашай краіны. Ён сімвалізуе сувязь часоў, пакаленняў і яднанне народа»[2]. Сувязь помніка з падзеямі 1939 г. узнікае толькі ў ідэалагічнай трактоўцы, якая прагучала падчас адкрыцця помніка 17 верасня 2021 г. у прамове кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта І. Сергяенкі[3]. Такім чынам, гэтыя прыклады спроб ушанавання і замацавання ў мемаратыўнай прасторы свята «Народнага адзінства» паказваюць, што пакуль уладамі не вынайдзеная адпаведная форма мастацкага ўвасаблення з адназначным палітычным прачытаннем.

## Гарадская прастора Гомеля

Гомель – адзін з лідараў па колькасці мемаратыўных аб’ектаў, уключаных у прастору абласных цэнтраў Беларусі (гл. Табл. 1а ў дадатку). Але пераважаюць тут таксама памятныя месцы, звязаныя з XX ст.

1 Спасылка
2 Спасылка
3 Спасылка

**Табліца 13.** Мемаратыўныя аб'екты Магілёва, прысвечаныя найноўшай гісторыі.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Расійская | Украінская |
|---|---|---|---|
| Старажытная гісторыя горада (заснаванне горада, археалагічная стаянка) | 4 | | |
| Культура (літаратура, асвета, мастацтва) | 1 | 2 | |
| Вайсковыя і палітычныя дзеячы перыяду ВКЛ | | | 1 |

Што датычыцца эпохі да XIX ст. (Табл. 13), то ёй прысвечана няшмат аб'ектаў, калі ўлічваць агульны маштаб мемарыяльнай прасторы Гомеля. Калі казаць пра постаці гістарычных асоб гэтай эпохі, якія ўшанаваны ў помніках і манументах, то да беларускага нацыянальнага кантэксту адносіцца помнік Кірылу Тураўскаму, які быў усталяваны ў горадзе ў 2004 годзе да Дня беларускага пісьменства. У Гомелі таксама ёсць бюст расійскаму асветніку Ламаносаву і ўкраінскаму вайскова-палітычнаму лідару Б. Хмяльніцкаму.

Украінскі фактар прысутны і сярод аб'ектаў, датычных да перыяду XIX ст. (Таб. 14). Два аб'екты ў Гомелі прысвечаныя асобе нацыянальнага ўкраінскага пісьменніка Т. Шэўчэнкі, помнікі гэтаму пісьменніку яшчэ ёсць у Брэсце і Магілёве. Адпаведна, у статыстычным сэнсе колькасць помнікаў украінскаму літаратару перавышае колькасць помнікаў Я. Купалу – якому прысвечана толькі два бюсты, адзін акурат знаходзіцца ў Гомелі. Калі мы

**Табліца 14.** Табліца 14. Мемаратыўныя аб'екты Гомеля, прысвечаныя XIX ст.

| Тэматыка/Памяць | Беларуская | Расійская | Украінская |
|---|---|---|---|
| Культура і літаратура | | 3 | 2 |
| Навука і адукацыя | 1 | | |
| Палітычныя і грамадскія дзеячы | 3 | 1 | |
| Лакальная гісторыя горада | | 2 | |

паглядзім на беларускую нацыянальную скіраванасць дзеячаў XIX ст., то тут прадстаўлены выдатны беларускі навуковец, этнограф Еўдакім Раманаў. І яшчэ тры аб'екты, звязаныя з беларускім нацыянальным кантэкстам, прысвечаны адной асобе – грамадскай дзяячцы Ірыне Паскевіч. Нягледзячы на расійскае паходжанне, гэтая асоба зрабіла вялікі ўнёсак у развіццё горада, яго грамадскага жыцця і мецэнацкай справы. Астатнія аб'екты адносяцца да расійскага гісторыка-культурнага кантэксту.

Калі казаць пра мемаратыўны комплекс Гомеля, датычны да гісторыі XX ст. (гл. Табл. 6а ў дадатку), то гэты абласны цэнтр з'яўляецца самым савецкім у гэтым сэнсе. Тут прысутная найбольшая колькасць мемарыяльных аб'ектаў, якія ўшаноўваюць памяць пра Кастрычніцкую рэвалюцыю і яе лідараў. У Гомелі найбольшая колькасць помнікаў Леніну, калі ўлічыць помнік маленькаму Валодзю Ульянаву. Апроч помнікаў ВАВ, у Гомелі адносна шмат мемаратыўных аб'ектаў, прысвечаных палітычным дзеячам, тэхналогіям, прамысловасці і будаўніцтву савецкага перыяду.

Калі казаць пра падзеі познесавецкага перыяду, то ў Гомелі ёсць два аб'екты, прысвечаныя аварыі на ЧАЭС. Асноўным з іх з'яўляецца храм-помнік архангела Міхаіла, які ўшаноўвае памяць пра ахвяр атамнай катастрофы. Унікальнасць аб'екта заключаецца ў тым, што царква з'яўляецца помнікам архітэктуры XIX ст., яна была перанесена ў Гомель з выселенай вёскі з забруджанага раёна, што мае вялікае сімвалічнае значэнне як месца памяці пра страчаныя населеныя пункты і іх культурную спадчыну. Адначасова важна заўважыць, што помнікі аварыі на ЧАЭС, апроч Гомеля, ёсць толькі ў Магілёве, дзе пастаўлены памятны знак у гонар ліквідатараў аварыі. Гэта сітуацыя дэманструе пэўную рэгіяналізацыю памяці пра Чарнобыль, якая з нацыянальнага маштабу перанесеная на ўзровень лакальнай тэхнагеннай катастрофы.

**Табліца 15.** Мемаратыўныя аб’екты Гомеля, прысвечаныя найноўшай гісторыі.

| Якія падзеі, героі, з’явы ўшаноўваюцца | Колькасць аб’ектаў |
|---|---|
| Навука і адукацыя | 4 |
| Армія і авіяцыя | 2 |
| Архітэктура і будаўніцтва | 2 |
| Праваахоўныя органы (МУС і інш. сілавыя службы) | 3 |
| Дзяржаўныя службы (МНС і інш.) | 5 |
| Медыцына | 1 |
| Лакальная гісторыя горада | 2 |
| Іншыя | 2 |

Дзеля справядлівасці адзначым, што ў раённых гарадах Гомельскай вобласці на сённяшні дзень існуе шмат памятных месцаў, прысвечаных аварыі, але гэта хутчэй падкрэслівае тэндэнцыю да рэгіяналізацыі ва ўмовах, калі на рэспубліканскім узроўні няма ні мемарыяла, ні музея нацыянальнага маштабу, прысвечаных катастрофе.

У Гомелі дастаткова шмат аб’ектаў, прысвечаных найноўшай гісторыі (Табл. 15). Сярод іх на фоне астатніх абласных гарадоў вылучаюцца аб’екты, якія мемарыялізуюць сферу навукі, архітэктуры і будаўніцтва. У дадзеным выпадку гэта звязана з мэтанакіраванай дзейнасцю па мемарыялізацыі, якую праводзяць асобныя праектныя і даследчыя інстытуты Гомеля. Аднак у дачыненні да сферы культуры такая праца настолькі актыўна не вядзецца.

## Падсумаванне і высновы

Для падсумавання звернемся да дыяграм, на якіх адлюстраваная агульная сітуацыя па ўсіх абласных цэнтрах па кожным храналагічным перыядзе (глядзі дыяграмы № 1-7 у дадатку).

З гэтых абагульненых дадзеных вынікае, што гісторыя да XIX ст. прадстаўлена ў большай ступені помнікамі, прысвечанымі беларускім нацыянальным асобам, падзеям ці лакальнаму мінуламу гарадоў. Аднак колькасць такіх месцаў памяці досыць нешматлікая ў параўнанні з іншымі эпохамі, хоць нельга сказаць, што такія аб'екты не з'яўляліся за апошнія дзесяцігоддзі ў Беларусі (лідарам тут з'яўлялася Гродна). Аднак на агульным фоне дамінавання ў ландшафце памяці пра XX ст. гэтыя аб'екты могуць губляцца ў гарадской прасторы.

Што датычыцца эпохі XIX ст., то тут мы назіраем поўную адсутнасць прадстаўленасці беларускай культуры, адпаведна, назіраецца відавочны каланіяльны характар камемаральнай прасторы, якая рэпрэзентуе культуру гэтага перыяду пераважна праз постаці расійскіх дзеячаў і творцаў. Прадстаўленасць беларускага нацыянальнага кантэксту ёсць у сферы навукі і лакальнай гісторыі гарадоў, а таксама гісторыі тэхналогій. Але калі казаць пра якасны ўзровень гэтай прадстаўленасці, то ўсё ж культурныя і вайскова-палітычныя дзеячы рэпрэзентаваны больш заўважнымі ў гарадскім ландшафце помнікамі ці манументамі, якія часцяком усталяваныя на вуліцах ці ў скверах, якія носяць імёны гэтых асоб, у той час як дзеячы навукі пераважна прадстаўлены памятнымі шыльдамі.

Калі мы прааналізуем рэпрэзентацыю памяці пра XX ст., то тут больш за палову – гэта мемаратыўныя аб'екты, прысвечаныя падзеям ВАВ. Другой па колькасці з'яўляецца памяць пра Кастрычніцкую рэвалюцыю, рэвалюцыйных ды камуністычных лідараў. Калі казаць пра нацыянальна-дзяржаўную прыналежнасць памяці, то ў пераважнай большасці мемаратыўныя аб'екты, якія адлюстроўваюць гісторыю XX ст., адносяцца да савецкай традыцыі ці спадчыны. Відавочна, што гэта выклікае праблематычны перакос прасторы памяці, які адбіваецца не найлепшым чынам на калектыўнай памяці беларусаў.

З аднаго боку, гэта нівеліруе сам сэнс камемаратыўнай традыцыі, бо частка савецкіх помнікаў ужо не мае ідэалагічнага абгрунтавання і не падсілкоўваецца актуальным культурным кантэкстам, у выніку помнікі страчваюць свой сэнс ды змест, ад іх застаецца толькі мастацкая форма. З іншага боку, беларускія ўлады імкнуцца скарыстацца гэтай савецкай мемаратыўнай спадчынай у сваіх палітычных мэтах і пачынаюць актыўна выкарыстоўваць гэтыя аб’екты для правядзення ўласных палітычных акцый.

Важнай асаблівасцю з’яўляецца тое, што перыяд СССР прадстаўлены ў пераважнай большасці аб’ектамі, якія носяць беларускую савецкую, а не агульнасавецкую памяць (гл. Дыяграму 4). Гэты аспект дазваляе пераасэнсоўваць гэтыя памятныя месцы ў далейшым, пераносячы акцэнт у іх інтэрпрэтацыі на нацыянальны чыннік, мясцовае паходжанне і г. д.

Такім чынам, асновай мемарыяльнай прасторы абласных гарадоў Беларусі застаецца памяць пра ВАВ, якая ўвасабляецца дагэтуль у пераважнай большасці ў савецкіх ці выкананых у савецкай традыцыі помніках, манументах, шыльдах і г. д. Галоўны пафас, які нясуць гэтыя аб’екты, – гераічнасць, самаахвярнасць і самаадданасць. Калі мы паглядзім на колькасць помнікаў, прысвечаных ахвярам і трагедыі вайны, то агулам яны складаюць зусім маленькую долю, хоць такія помнікі і працягваюць паўставаць у Беларусі, але яны не могуць канкурыраваць з дамінуючай роляй савецкіх мемарыялаў.

Калі разгледзець іншыя сферы савецкага мінулага, то заўважнае шырокае прадстаўніцтва сілавога дзяржаўнага складніка – гэта ўсё, што прысвечана міліцыі, органам КДБ/НКУС, арміі і авіяцыі. У той жа час у статыстыку нават не трапляюць помнікі ахвярам савецкіх рэпрэсій. Яны існуюць не ва ўсіх абласных цэнтрах, усталяваныя звычайна па грамадскай ініцыятыве і за кошт самой су-

польнасці, таму па гэтай тэматыцы не прадстаўлена буйных мемарыялаў. Таксама зазвычай яны ўсталяваныя на месцах масавага знішчэння ці захавання цел ахвяр (якія знаходзіліся на ўскрайку гарадоў ці іншых непрыкметных месцах), таму не займаюць заўважнага месца ў абшары гарадоў, у адрозненне ад помнікаў сілавікам, якія пераважна месцяцца ля будынкаў адпаведных структур у цэнтрах гарадоў.

Адным з заўважных напрамкаў у камемаратыўнай традыцыі, звязаных з познесавецкім перыядам, з'яўляецца памяць пра вайну ў Афганістане. Можна назіраць досыць вялікую колькасць аб'ектаў, якія практычна ўзніклі ў найноўшы час. Верагодна, у пашырэнні менавіта гэтай сферы ў сучаснай камемаратыўнай палітыцы ёсць лабіраванне з боку ўзброеных сіл ці асобных вайсковых часцей, як гэта бачна на прыкладзе Віцебска, а таксама ветэранскіх арганізацый воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія маюць пэўныя прывілеі ў дачыненнях з уладамі. Заўважную ролю ў мемаратыўнай палітыцы ў РБ мае БПЦ, якая ўплывае на фармаванне і кшталт комплексу мемарыяльных аб'ектаў. Да прыкладу, мемарыялы ў Віцебску, Гомелі і Магілёве, прысвечаныя воінам-інтэрнацыяналістам, выкананыя як праваслаўныя капліцы, а цэнтральны мемарыял ахвярам Чарнобыльскай аварыі, які знаходзіцца ў Гомелі, з'яўляецца праваслаўным храмам-помнікам.

Калі звярнуцца да культурнага складніка ў памяці пра XX ст., то колькасна беларуская нацыянальная культура прадстаўлена значна лепей, чым у папярэднім перыядзе. Аднак калі паглядзець на якасны чыннік, то сітуацыя не настолькі пазітыўная. У гонар беларускіх культурных дзеячаў пераважна ўсталёўваюцца памятныя шыльды на дамах, дзе яны пражывалі, ці на вуліцах, якія названыя ў іх гонар, у большасці гэта творцы, якія паходзяць ці пражывалі ў гэтых гарадах. Аднак вельмі мала помнікаў ці іншага роду манументаў, якія б ушаноўвалі памяць агульнана-

цыянальных дзеячаў і творцаў. Вылучыць можна помнік Шагалу і Караткевічу ў Віцебску, у Гродне і Гомелі памяць пра нацыянальнага паэта Я. Купалу ўшанавана бюстамі.

Калі ж паглядзець на тыя сферы жыцця ў найноўшай гісторыі, якія паддаюцца ўшанаванню, то заўважым пэўную перавагу дзяржаўна-сілавой над гуманітарна-культурнай сферай (гл. Дыяграму 5). У Беларусі мы бачым тэндэнцыю на замацаванне ў сферы памяці менавіта значэння дзяржаўных і сілавых структур, а не захаванне і ўслаўленне нацыянальнай культуры ці ўласных грамадска-палітычных лідараў, што зазвычай характэрна для камемаратыўных практык незалежных нацыянальных дзяржаў.

## Рэкамендацыі

Неабходным чыннікам для дэмакратызацыі культуры памяці ў Беларусі з'яўляцца крытычнае пераасэнсаванне прасторы гарадоў, яе дэкамунізацыя і дэкаланізацыя. Ніжэй мы дзелімся рэкамендацыямі, якія могуць паспрыяць гэтаму працэсу.

Неабходным бачыцца развіццё мемарыяльных аб'ектаў і практык у дачыненні да гістарычнага перыяду старажытнасці, ВКЛ і Рэчы Паспалітай, што можа дапамагчы зменшыць і адцяніць дамінацыю савецкай і каланіяльнай спадчыны, якая пануе дагэтуль у беларускіх гарадах.

Таксама важным у камемаратыўнай палітыцы з'яўляецца стварэнне комплексу памятных месцаў нацыянальнай культуры, помнікаў у гонар дзеячаў XIX ст., бо, як мы назіраем, сярод аб'ектаў, прысвечаных гэтай эпосе, цалкам адсутнічаюць прадстаўнікі нацыянальнай культуры, а таксама вобмаль грамадска-палітычных дзеячаў таго часу.

Відавочна, што памяць пра Другую сусветную вайну з'яўляецца важным складнікам калектыўнай памяці бе-

ларусаў, якую нельга проста адмяніць. Але цяпер тут абсалютна дамінуе савецкі падыход і традыцыя памяці аб вайне з перавагай гераічнага пафасу і мілітарыстычнага характару. Таму менавіта памяць пра ахвяр, трагічныя наступствы вайны і ўзнікненне адпаведных месцаў памяці і фарміраванне адпаведных камемаратыўных практык мусяць змяніць цяперашні прасавецкі вектар у мемарыяльный палітыцы, датычнай да ВАВ.

У дачыненні да савецкага перыяду таксама патрэбна пераасэнсаванне і ўмацаванне ў мемаратыўнай прасторы памяці пра такія трагедыі, як масавыя рэпрэсіі і аварыя на ЧАЭС. Неабходна стварэнне адпаведных помнікаў, мемарыялаў і музеяў нацыянальнага ўзроўню, каб даць адназначную трактоўку тых падзей і ўключыць гэтыя трагедыі належным чынам у культурную памяць беларусаў.

Відавочным з'яўляецца агульнае павелічэнне прысутнасці нацыянальнай беларускай культуры ў розных яе праявах (музыка, мастацтва, літаратура ды інш.) у мемаратыўным ландшафце беларускіх гарадоў, і істотна, каб гэта рабілася комплексна і адначасова на ўзроўні найменняў вуліц, надання назваў адпаведным установам, стварэння памятных шыльд і ўзвядзення помнікаў і манументаў.

У канцэптуальным сэнсе неабходнай з'яўляецца змена цяперашняй камемаратыўнай палітыкі, заснаванай на дзяржавацэнтрычным гістарычным наратыве, які быў сфармаваны ў ідэйна-палітычным дыскурсе беларускіх уладаў і на ўзроўні афіцыйнай палітыкі памяці. У ім акцэнт робіцца на дзяржаўнай прыналежнасці і ролі дзяржавы ў рэпрэзентацыі той ці іншай гістарычнай эпохі Беларусі, а не на нацыянальна-культурным фактары. Адпаведна, трэба правесці змены на карысць адлюстравання і ўшанавання нацыянальна-культурных і сацыяльна-гуманітарных каштоўнасцяў у прасторы памяці.

# Дадатак

**Табліца 1а.** Храналагічныя перыяды, якія прадстаўляюць мемаратыўныя аб’екты

| Горад/Перыяд | Гісторыя да XIX ст. | XIX ст. | XX ст. | Найноўшая гісторыя |
|---|---|---|---|---|
| Брэст | 9 | 15 | 160 | 24 |
| Гродна | 18 | 13 | 115 | 14 |
| Віцебск | 4 | 16 | 136 | 10 |
| Магілёў | 8 | 9 | 111 | 8 |
| Гомель | 8 | 12 | 157 | 21 |

**Табліца 2а.** Мемаратыўныя аб’екты Брэста, прысвечаныя XX ст.

| Тэмы/Памяць | | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларуская | Польская | Яўрэйская | Расійская | Армянская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Падзеі ВАВ 103 | Удзельнікам ВАВ, камандуючым, героям СССР, загінулым салдатам і г.д. | 78 | 8 | 1 | | | 1 | 1 |
| | Ахвярам вайны (мірным жыхарам, ваеннапалонным, вязням канцлагераў) | 11 | | | | | | |
| | Ахвярам Халакосту | | | | | 3 | | |
| Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., рэвалюцыйны рух і яго дзеячы | | 3 | 4 | | | | | |
| Падзеі 1939, дзейнасці і дзеячам КПЗБ | | 11 | | | 1 | | | |
| Культура, літаратура, мастацтва | | 4 | 3 | | | | | |

| Тэмы/Памяць | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларуская | Польская | Яўрэйская | Расійская | Армянская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Навука і адукацыя | 1 | | | | | | |
| Палітычныя і грамадскія дзеячы | 4 | | | | 2 | | |
| Армія і авіяцыя | 4 | | | | | | |
| Органы МУС і іншыя сілавыя структуры | 3 | | | | | | |
| Лакальная гісторыя горада | | | 3 | | 1 | | |
| Вайна ў Афганістане | 2 | | | | | | |
| Першая сусветная вайна | | | | | | 2 | |
| Савецка-польская вайна (1919-1921) | | | | 3 | | | |
| Савецкія рэпрэсіі | | 1 | | | | | |
| Руска-японская вайна | | | | | | 1 | |
| Выпрабаванні ядзернай зброі ў СССР | 1 | | | | | | |
| Іншыя | 3 | 1 | | 1 | | | |

## **Табліца 3а.** Мемаратыўныя аб'екты Гродна, прысвечаныя XX ст.

| Тэмы/Памяць | | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларуская | Расійская | Польская | Яўрэйская | Літоўская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Падзеі ВАВ 88 | Удзельнікам ВАВ, камандуючым, героям СССР, загінулым салдатам і г.д. | 44 | | | | | | |
| | Ахвярам вайны (мірным жыхарам, ваеннапалонным, вязням канцлагераў) | 3 | | | | | | |
| | Ахвярам Халакосту | | | | | | 1 | |

| Тэмы/Памяць | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларус-кая | Расій-ская | Поль-ская | Яўрэй-ская | Літоў-ская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., рэвалюцыйны рух і яго дзеячы | 1 | 6 | | | | | |
| Падзеі 1939, дзейнасць і дзеячы КПЗБ | 11 | | | 1 | | | |
| Культура, літаратура, мастацтва | 4 | 3 | | | | | |
| Навука і адукацыя | 1 | | | | | | |
| Органы МУС і іншыя сілавыя структуры і службы | 4 | | | | 2 | | |
| Вайна ў Афганістане | 8 | | | | | | |
| Медыцына | 3 | | | | | | |
| Першая сусветная вайна | | | | 1 | | | |
| Савецка-польская вайна (1919-1921) | | | | | 2 | | |
| Спорт | 1 | | | | | | |
| Савецкія рэпрэсіі | | | | | 1 | | |
| Палітычныя і грамадскія дзеячы | 1 | | | 1 | | | |
| Армія і авіяцыя | | 1 | | | | | |

## **Табліца 4а.** Мемаратыўныя аб’екты Віцебска, прысвечаныя XX ст.

| Тэмы/Памяць | | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларус-кая | Расій-ская | Яўрэй-ская | Поль-ская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Падзеі ВАВ 55 | Удзельнікам ВАВ, камандуючым, героям СССР, загінулым салдатам і г.д. | 46 | 1 | 2 | | | |
| | Ахвярам вайны (мірным жыхарам, ваеннапалонным, вязням канцлагераў) | 2 | | 2 | | | |
| | Ахвярам Халакосту | | | | | 2 | |

| Тэмы/Памяць | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларус-кая | Расій-ская | Яўрэй-ская | Поль-ская |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., рэвалюцыйны рух і яго дзеячы | 3 | 7 | | | | |
| Падзеі 1939, дзейнасць і дзеячы КПЗБ | 3 | | | | | |
| Культура, літаратура, мастацтва | 14 | 1 | 4 | 1 | | |
| Навука і адукацыя | 2 | | 2 | 1 | | |
| Армія, авіяцыя | 6 | 3 | | | | |
| Вайна ў Афганістане | 12 | | | | | |
| Палітычныя і грамадскія дзеячы | 4 | | | | | |
| Транспарт і камунікацыі | 1 | | 2 | | | |
| Прамысловасць | 2 | | | | | |
| Іншыя | 1 | | | | | 1 |

## **Табліца 5а.** Мемаратыўныя аб'екты Магілёва, прысвечаныя XX ст.

| Тэмы/Памяць | | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларус-кая | Расій-ская | Нямец-кая | Яўрэй-ская | Поль-ская | Армян-ская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Падзеі ВАВ 76 | Удзельнікам ВАВ, камандуючым, героям СССР, загінулым салдатам і г.д. | 64 | 2 | | | | | | 1 |
| | Ахвярам вайны (мірным жыхарам, ваеннапалонным, вязням канцлагераў) | 4 | | 2 | | 1 | | | |
| | Ахвярам Халакосту | | | | | | 2 | | |
| Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., рэвалюцыйны рух і яго дзеячы | | 4 | 8 | | | | | | |
| Культура, літаратура, мастацтва | | 7 | | 1 | | | | | |
| Навука і адукацыя | | 1 | 1 | | | | | | |

| Тэмы/Памяць | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларус-кая | Расій-ская | Нямец-кая | Яўрэй-ская | Поль-ская | Армян-ская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вайна ў Афганістане | 1 | | | | | | | |
| Аварыя на ЧАЭС | | | 1 | | | | | |
| Першая сусветная вайна | | | | 1 | | | | |
| Савецка-польская вайна (1919-1921) | 1 | | | | | | | |
| Спорт | 1 | | | | | | | |
| Савецкія рэпрэсіі | | | 2 | | | | | |
| Армія, авіяцыя | 1 | | | | | | | |
| Тэхналогіі і прамысловасць | 1 | 2 | | | | | | |
| Рэлігійныя | | | | | | | 1 | |

## **Табліца 6а.** Мемаратыўныя аб'екты Гомеля, прысвечаныя ХХ ст.

| Тэмы/Памяць | | Бел-кая савецкая | Савецкая | Беларус-кая | Яўрэй-ская |
|---|---|---|---|---|---|
| Падзеі ВАВ 82 | Удзельнікам ВАВ, камандуючым, героям СССР, загінулым салдатам і г.д. | 73 | 5 | | |
| | Ахвярам вайны (мірным жыхарам, ваеннапалонным, вязням канцлагераў) | 2 | | | |
| | Ахвярам Халакосту | 1 | | | 1 |
| Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., рэвалюцыйны рух і яго дзеячы | | 9 | 13 | | |
| Культура, літаратура, мастацтва | | 5 | 4 | | |
| Навука і адукацыя | | 4 | | | |
| Армія, авіяцыя | | 1 | 1 | | |
| Вайна ў Афганістане | | 7 | | | |
| Аварыя на ЧАЭС | | | | 2 | |
| Палітычныя дзеячы | | 2 | 1 | | |
| Органы МУС і інш. сілавыя структуры | | 3 | | | |
| Транспарт і камунікацыі | | 2 | 3 | | |
| Архітэктура і будаўніцтва | | 2 | | | |
| Тэхналогіі і прамысловасць | | 2 | 2 | | |
| Савецка-польская вайна | | 1 | | | |
| Грамадзянская вайна ў Іспаніі | | 2 | | | |
| Медыцына | | 1 | | | |
| Падзеі 1939, дзейнасць і дзеячы КПЗБ | | 1 | | | |
| Рэлігійныя | | | | 3 | |
| Іншыя | | 2 | 3 | | |

**Дыяграма 1.** Мемаратыўныя аб’екты ўсіх абласных цэнтраў агулам, прысвечаныя перыяду гісторыі да XIX ст.




**Дыяграма 2.** Мемаратыўныя аб’екты ўсіх абласных цэнтраў агулам, прысвечаныя XIX ст.



**Дыяграма 3.** Мемаратыўныя аб'екты ўсіх абласных цэнтраў агулам, прысвечаныя XX ст., паводле тэматычнай прадстаўленасці




**Дыяграма 4.** Мемаратыўныя аб'екты ўсіх абласных цэнтраў агулам, прысвечаныя XX ст., паводле нацыянальна-культурнай прыналежнасці памяці.



**Дыяграма 5.** Мемаратыўныя аб’екты ўсіх абласных цэнтраў агулам, прысвечаныя найноўшай гісторыі, паводле тэматычнай прадстаўленасці.

